# КЛІО Ў ВІРТУАЛЬНЫМ АБЛІЧЧЫ

## ЯК ПРАДСТАЎЛЕНА Ў ІНТЭРНЭЦЕ ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ



**Аляксей МАЦАВІЛА,**
**намеснік начальніка аддзела падтрымкі і развіцця інтэрнэт-рэсурсаў БелТА**

**Гісторыя побач. Да яе можна дакрануцца ля муроў Мірскага замка ці пад зводамі полацкай Сафіі, спасцігаць па старонках летапісаў і хронік, назіраць у экспазіцыях музеяў. Але ажывае яна толькі ў чалавечай душы. Вандруючы ў прасторы і ў часе, людзі заўжды бяруць яе з сабой. І пакуль гэта так – гісторыя жыве. На мяжы другога і трэцяга тысячагоддзяў чалавецтва стварыла Інтэрнэт і зараз актыўна яго асвойвае. З кожным годам у шэрагах віртуальных вандроўнікаў усё больш нашых суайчыннікаў. Ці захапілі яны с сабою родную гісторыю? І як пачувае сябе беларуская Кліо ў віртуальным абліччы?**

Сайтаў, на якіх змяшчаюцца звесткі па гістарычнай спадчыне Беларусі, удалося налічыць каля 300 – без уліку блогаў (інтэрнэт-дзённікаў) і выключна англамоўных рэсурсаў (апошнія патрабуюць асобнага артыкула). Прыблізна палову з іх складаюць сайты беларускіх гарадоў і нават вёсак – як афіцыйныя, так і прыватныя. Да іх трэба дадаць інтэрнэт-старонкі краязнаўчага кірунку. Шырока прадстаўлены музеі і помнікі архітэктуры. Сваю лепту ў папулярызацыю гістарычнай спадчыны ўносяць турыстычныя вэб-рэсурсы. Ёсць адмысловая ніша ў геральдычных і генеалагічных старонак, а таксама ў рыцарскіх клубаў. Сціпла выглядаюць паказчыкі асветных і навуковых сайтаў – разам узятых іх знайшлося меней за 15.

Разважанні над прагледжанымі старонкамі ўклаліся ў некалькі сюжэтаў.

### ЦЯЖКАСЦІ – І НАВАТ НЕ ПЕРАКЛАДУ

У пошуках дакладнай інфармацыі карыстальнік Інтэрнэта звычайна звяртаецца да віртуальных энцыклапедый. Найбольш папулярная з іх – Вікіпедыя. Беларусы карыстаюцца як беларускамоўнай (**be.wikipedia.org**), так і рускамоўнай (**ru.wikipedia.org**) версіямі. Дык вось, па запыце «Гісторыя Беларусі» (ці адпаведна «История Белоруссии») можна атрымаць звесткі, што адрозніваюцца не толькі мовай. Напрыклад, у рускамоўнай версіі выкарыстоўваюцца паняцці «древнерусская народность», «Древнерусское государство», «западнорусская языковая общность», «западнорусский письменный язык» (на якім, паводле артыкула, друкаваў свае кнігі Ф. Скарына). У беларускамоўнай яны не ўзгадваюцца. У той жа час у апошняй адзначаецца шырокае распаўсюджанне ўніяцтва пасля 1596 года, сцвярджаецца, што Контррэфармацыя і дзейнасць ордэна езуітаў спарадзілі ўздым асветніцтва, адукацыі і культуры. Зазначаецца, што ўключэнне Беларусі ў моцны расійскі рынак спрыяла ажыўленню вытворчасці, развіццю прамысловасці і гандлю, сельскай гаспадаркі, але разам з тым у XIX стагоддзі пачаўся перыяд гвалтоўнай русіфікацыі, ушчамлення ў правах насельніцтва каталіцкага і ўніяцкага веравызнання. Ёсць адрозненне і ў адлюстраванні падзей XX стагоддзя. У рускамоўнай версіі падкрэсліваецца, што абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі здзейснілі «представители нескольких национальных движений в условиях немецкой оккупации», а ў беларускамоўнай – што, выдаўшы рэзалюцыю пра ўтварэнне Савецкай Рэспублікі Беларусь, 6-я Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б) фактычна «ўзяла на сябе функцыі ўстаноўчага сходу і парламенту». У дачыненні да Другой сусветнай вайны адна версія робіць акцэнт на буйны партызанскі рух супраць акупантаў, другая ж сцвярджае: «шмат у

якіх мясцінах нямецкія войскі прымаліся як вызваліцелі».
Цікава, як будзе выходзіць з гэтых супярэчнасцей школьнік ці студэнт?

## ПРЫКМЕТА ЧАСУ – «ПОП-ГІСТОРЫЯ»

У эпоху, калі папулярнасць поп-музыкі ды іншых форм масавай культуры пераўзыходзіць цікавасць да класікі, не дзіўна назіраць падобную з'яву і ў адносінах да гісторыі.
Сярод інтэрнэт-рэсурсаў, што маюць дачыненне да гістарычнай праблематыкі, ледзь не найбольшай папулярнасцю (што пацвярджаецца статыстыкай наведванняў) карыстаюцца сайты рыцарскіх клубаў: **alterego.tut.by, www.bel-knight.com, gridni.historicus.info** ды іншыя – усяго ўдалося адшукаць 11.
З аднаго боку, рыцарскія клубы займаюцца рэканструкцыяй найбольш яркіх атрыбутаў мінуўшчыны – турніраў, даспехаў, касцюмаў, музыкі, танцаў, звычаяў – і гэтым спрыяюць папулярызацыі гісторыі Сярэдневякоўя (у тым ліку айчыннай). Але для апошняй, дзякуючы празмерна вольнай інтэрпрэтацыі аматарамі, існуе небяспека моцна адхіліцца ад рэчаіснасці – ператварыцца ў «поп-гісторыю», дзе дакладнасцю ахвяруюць на карысць рамантызму і маляўнічасці. Гэтаму спрыяе і адсутнасць у такіх клубаў навуковых кіраўнікоў ці хоць бы кансультантаў.
Калі аматары займаюцца рэканструкцыяй гісторыі Германіі ці Італіі (**sword-and-raven.org**) або эпохі вікінгаў (**nvepr.narod.ru**) – гэта, можа, і не зусім патрыятычна, але больш бяспечна. А вось быць дакладным у дэталях айчыннай гісторыі складана, тым больш калі займацца гісторыяй адначасова і Заходняй Еўропы, і Вялікага княства Літоўскага, як гэта робіць, напрыклад, ваенна-гістарычны клуб «Дзікае паляванне» (**www.wild-hunt.narod.ru**). Дарэчы, на сайце клуба дэкларуецца, што галоўная мэта згуртавання – «воссоздание духа романтизма Средневековья, традиций и обычаев в их лучших проявлениях» (тут і далей мова і арфаграфія сайтаў захоўваюцца. – *А.М.*).
Наколькі далёка могуць заходзіць адвольныя інтэрпрэтацыі гісторыі Сярэдневякоўя, добра бачна на прыкладзе сайта рыцарскага клуба «Фенрыр» з Гомеля (**www.fenrirgomel.narod.ru**). Ён пазіцыянуе сябе як наёмны атрад XIV стагоддзя з назвай, запазычанай са скандынаўскай міфалогіі (анахранізм). Яго дэвіз: «Мы отрекаемся от ярлыков. Мы сражаемся за деньги и нечто неопределимое под названием «гордость». Политика, этика и мораль к делу не относятся». Добра бачны адыход не толькі ад айчыннай гісторыі, але і ад катэгорый сярэдневяковай ментальнасці.
Вельмі паказальная эвалюцыя клуба «Орден меченосцев Монсегюра», пра які можна даведацца на сайце **alterego.tut.by/clubs/oira**. Ён быў заснаваны ў 1996 годзе ў Пінску. Спачатку меў назву «Зніч» і займаўся рэканструкцыяй зброі ваяроў старажытнай Русі. З цягам часу спектр інтарэсаў зрушыў у бок заходнееўрапейскага рыцарства. Вось што з гэтага атрымалася: «В основу доктрины клуба легли события времен Альбигойских войн и легенда о Святом Граале, который был унесен из замка Монсегюр накануне падения этого последнего оплота катаров. Поскольку в настоящее время меч не является орудием убийства, члены клуба рассматривают его как инструмент духовного очищения. Современный человек, взяв в руки меч, становится чище и благороднее. Поэтому члены клуба называют себя меченосцами Монсегюра. Орденской одеждой является белое котто, символизирующее стремление к нравственной чистоте. Украшающая котто алая руна «Тейваз» указывает путь самосовершенствования посредством рыцарских единоборств». Каментарыі можна даваць розныя, але відавочна адно – да гістарычнай рэчаіснасці дзейнасць клуба цяпер дачынення не мае.
Хацелася б усё ж такі, каб папулярызацыя рыцарскімі клубамі айчыннай гісторыі не прывяла да яе мутацыі ў «поп-гісторыю».

**МАЦАВІЛА**
**Аляксей Яўгенавіч.**
Нарадзіўся ў 1976 годзе ў в. Ендрыхоўцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.
У 1999 годзе скончыў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы, у 2002-м – аспірантуру Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
Выкладаў у Гродзенскім і Беларускім дзяржаўных універсітэтах. З 2004 года працаваў у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на пасадах загадчыка сектара маладзёжнай палітыкі НДІ, начальніка аддзела сацыяльных тэхналогій НДІ, намесніка дырэктара Інавацыйнага цэнтра.
Са снежня 2008 года – намеснік начальніка аддзела падтрымкі і развіцця інтэрнэт-рэсурсаў БелТА.
Сфера навуковых інтарэсаў: дзяржаўная маладзёжная і кадравая палітыка, інавацыйныя тэхналогіі ў сістэме дзяржаўнага кіравання.

...Спроба ператварыць гісторыю ў абгрунтаванне мілага сэрцу міфа можа трансфармаваць яе ў эпапею фэнтазі – накшталт вядомых твораў Толкіена. І тады моладзь хутка пачне шукаць эльфаў у Белавежы і хобітаў на Палессі.

## СУСТРЭЦЦА З ЭЛЬФАМ У БЕЛАВЕЖЫ...

Рамантызм у дачыненні да мінуўшчыны роднага краю не заўсёды нараджае патрыятызм. Часам людзі ствараюць такі вобраз айчыннай гісторыі, які самі жадалі б бачыць – нібы той Пігмаліён, што замест рэальнай дзяўчыны закахаўся ў статую, створаную паводле яго ідэалу, і спрабаваў ажывіць яе. А потым з гэтага вобразу робяць праекцыю на сучаснасць і патрабуюць яе карэкцыі ў рэчышчы ўласных уяўленняў пра мінулае.

Калі праглядаеш некаторыя інтэрнэт-старонкі, прысвечаныя беларускай гісторыі, то часам узнікае адчуванне, быццам яны прасякнуты пігмаліёнаўскай інтэнцыяй. Напрыклад, «жыхар Палангі, Коўна, Вількаміру, Сьвянцянаў альбо Вільні, Горадні, Наваградку і нават Менску ёсьць літвінам, незалежна ад таго, ці ён гутарыць па-літоўску, па-польску або па-беларуску. Увесь уклад ягонага жыцьця, звычаяў, сам сэнс ягонага існаваньня нагэтулькі паўсюдна аднолькавы, што апрача мовы цяжка заўважыць якую-кольвек іншую розніцу. А гэта пацьвярджае, што на ўсім абшары Літвы жыве адна нацыя, спаяная цягам стагодзьдзяў супольнай крывёй літоўцаў, палякаў і беларусаў». Прыводзячы гэтую цытату Баляслава Ялавецкага, суразмоўцы на сайце Цэнтра этнакасмалогіі «Kryuja» (**kryuja.org**) адразу ж і тлумачаць, чым яна для іх прывабная: «Для беларускай ідэнтычнасьці Літва істотная тым, што яна стварае адну з яе пэрспэктываў. Гэта тое, што абумоўлівае адрознасьць беларускай гісторыі і традыцыяў ад расейцаў, палякаў, украінцаў». Такім чынам, міфалагічны пафас набывае канкрэтны геапалітычны сэнс.

Але спроба ператварыць гісторыю ў абгрунтаванне мілага сэрцу міфа можа трансфармаваць яе ў эпапею фэнтазі – накшталт вядомых твораў Толкіена. І тады моладзь хутка пачне шукаць эльфаў у Белавежы і хобітаў на Палессі. Не верыцца? Дык, калі ласка, наведайце сайт **belarus-n.chat.ru**, дзе вас чакае «первый кельтский ресурс Белорусского Интернета». Уладальнікі сайта сцвярджаюць, што «вас ждут сенсационные открытия, которые некоторые историки в силу консервативности своих взглядов боятся представить общественности. Например, могли ли вы подумать о том, что Белорусы и Кельты имеют общую историю, что древние Белорусы внесли значительный вклад в становление культуры и цивилизации Кельтов и наоборот?».

Дык што – на чарговае Купалле шукаем эльфаў?

## ŽYVIE BIEŁARUŚ, АЛЬБО ГІСТОРЫК ЯК ADVOCATUS DIABOLI

Некаторыя гістарычныя сайты наскрозь прасякнутыя асветным пафасам. Вось і «Бібліятэка гістарычных артыкулаў «ŽYVIE BIEŁARUŚ» (**jivebelarus.net**) дэкларуе: «Не ведаць гісторыю Беларусі – гісторыю сваёй краіны, гісторыю сваіх продкаў – гэта дурная тэндэнцыя ў сучасным грамадстве. А без гэтых ведаў немагчыма лічыць сябе сапраўдным беларусам! Толькі памятаючы пра сваё старажытнае мінулае можна ўпэўнена рушыць у будучыню! Шмат гадоў нам даводзілі, што мы не нацыя, а толькі нейкі прыдатак расейскага народу. Але гэта ў корані падман, хлусня ды й проста глупства! Вялікае Княства Літоўскае і яго багатая і слаўная гісторыя пераканаўча сведчаць аб тым, што беларускі народ заўжды быў самастойным і самабытным, з унікальнай культурай і звычаямі! Матэрыялы, сабраныя на гэтым сайце, прызваны гэта пацвердзіць». Сапраўды, не ведаць гісторыю дрэнна, таму з вялікай цікавасцю звернемся да матэрыялаў, сабраных на згаданым сайце.

Рубрыка «Гістарычны каляндар»: «20 студзеня 1886. Нарадзіўся Фабіян Акінчыц. Беларускі палітычны дзеяч, юрыст, выдавец, публіцыст. Лідар беларускіх нацыянал-сацыялістаў...»

Рубрыка «Новыя артыкулы»: Ю. Туронак «Дзейнасць групы Фабіяна Акінчыца (1939–1943)», Ю. Грыбоўскі «Беларускі легіён СС: міфы і рэчаіснасць».

Рубрыка «Асобы»: Ю. Туронак «Фабіян Акінчыц – правадыр беларускіх нацыянал-сацыялістаў».
Рубрыка «Найноўшая гісторыя»: Л. Юрэвіч «Жыццё пад агнём. Партрэт беларускага военачальніка і палітычнага дзеяча Барыса Рагулі на фоне яго эпохі»...
Можна працягваць і далей. Але і так відавочна, што сярод артыкулаў гісторыкаў Г. Сагановіча, С. Марозавай ці С. Куль-Сяльвестравай, сапраўды прысвечаных ВКЛ, чамусьці ўтульна ўладкаваліся матэрыялы пра фашысцкіх калабарантаў. Дзеля чаго? Неяк не спалучаецца гэта з пафасам звароту да карыстальнікаў. Няўжо менавіта на такіх прыкладах павінен фарміравацца патрыятызм? Ці беларуская зямля настолькі бедная на герояў, што і такія пойдуць?
Уладальнікі сайта могуць спаслацца на тое, што Тацыт вучыў пісаць гісторыю sine ira et studio («без гневу і прадузятасці»). Ды прадузятасць можа выяўляцца не толькі ў ацэнках, але і ў іх адсутнасці. Аўтары вышэйназваных артыкулаў гіпердалікатныя ў дачыненні да сваіх герояў: падрабязна называюць даты, імёны, нумары вайсковых злучэнняў – і ні слова пра ўдзел беларускіх нацыяналістаў у жудасных гітлераўскіх злачынствах. І гэта ўжо пазіцыя! Пазіцыя гісторыка як advocatus diaboli (абаронцы д'ябла).
А чаму б таму самаму Ю. Туронку не пракаменціраваць цытату правадыра беларускіх нацыстаў Акінчыца з уласнага артыкула: «Мы, беларусы, не павінны ацэньваць гэтую вайну толькі праз прызму беларускіх інтарэсаў. Мы павінны ўсвядоміць сабе, што вайна вядзецца ў імя будучыні ўсяго цывілізаванага свету. Ад таго, якая сіла пераможа, будзе залежаць лёс усіх народаў. Таму мы не можам абмяжоўвацца сутнасна памылковай формулай: «Пачакаць і пабачыць, якая сіла будзе карыснейшай для беларускай справы». Больш за тое, вайна вядзецца дзеля перабудовы Еўропы на новых гаспадарчых і палітычных асновах. Якой бы ні была гэтая Еўропа ў найбліжэйшай будучыні, мы, беларусы, не павінны шкадаваць Еўропы перадваеннай. Нічога ў ёй мы не мелі і мець не маглі... Не мелі мы ў сваім краі ніякіх магчымасцяў для працы, нацыянальнай не толькі па духу, але і па форме. Затое цяпер такую магчымасць маем».

**На гэту пазіцыю нельга заплюшчваць вочы, бо пошасць гераізацыі фашызму можа распаўсюдзіцца. І ўжо не вельмі здзіўляешся, калі сустракаеш на неафіцыйным сайце Смалявічаў (www.smaliavichy.org) такія старонкі, як «Утварэньне Беларускай Краёвай Абароны», «Беларуская Краёвая Абарона ў Смалявіцкім павеце». Нагадаем, што адбываецца гэта фантасмагорыя ў тым жа рэгіёне, дзе знаходзіцца агульнанародны сімвал барацьбы і перамогі нашага народа над фашызмам – Курган Славы.**

Тут якраз да месца было б спаслацца на нейкі інтэрнэт-рэсурс, дзе можна атрымаць поўную і дакладную інфармацыю пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі – толькі, на жаль, няма такога. На сайце Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (**www.warmuseum.by**) ёсць малюнкі, плакаты, апісанні экспазіцый, але непасрэдна хронікі падзей, матэрыялаў па дыскусійных пытаннях няма. На сайце Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» (**www.khatyn.by**) тэма фашысцкага генацыду на Беларусі асвятляецца, але вельмі лаканічна. У Нацыянальнага гістарычнага музея сайта няма. Мы ўвогуле, як ні дзіўна, не маем ніводнага інтэрнэт-рэсурса, які б сістэмна, дакладна і падрабязна распавядаў пра падзеі айчыннай гісторыі.

### «ГЛОБУС БЕЛАРУСІ»

Не, гэта не айчынны варыянт вядомага анекдота, а праект на партале **tut.by** – інфармацыя пра архітэктурныя ды іншыя унікальныя аб'екты нашай краіны (больш за 8000).
Трэба зазначыць, што архітэктурнай і культурнай спадчыне Беларусі ў

Інтэрнэце пашанцавала болей, чым акадэмічнай гісторыі краіны. Сайты гарадоў, музеяў і турыстычных кампаній навыперадкі прэзентуюць палацы, замкі і сядзібы.

Варта прыгадаць некаторыя з іх: **palac.by** – спроба сабраць інфармацыю пра ўсе галоўныя архітэктурныя помнікі нашай краіны на адным сайце; **www.dorogiby.info** – грунтоўнае апісанне экскурсійных маршрутаў па славутых мясцінах Беларусі; **www.luvre.land.ru** – вэб-апавяданні пра Мінск, яго вуліцы, будынкі, паркі, музеі і гэтак далей.

Матывацыя стваральнікаў такіх сайтаў, як і вынікі іх працы, розная. Турыстычныя кампаніі дбаюць, вядома ж, пра камерцыйны інтарэс. Ад мясцовых улад варта было б чакаць таго ж, бо гістарычны турызм для некаторых рэгіёнаў мог бы стаць добрым прыбыткам. Але бывае і так, што неафіцыйны сайт, які не мае на мэце прыцягнуць у горад турыстаў, аказваецца больш інфарматыўным у гістарычным плане, чым сайт выканкама.



Фрагмент галоўнай старонкі інтэрнэт-сайта palac.by

Напрыклад, на афіцыйным сайце Пінскага райвыканкама (**pinsk.brest-region.by**) багатая гісторыя гэтага рэгіёну ўмясцілася ў 44 радкі, а ў фотагалерэі няма ніводнага здымка архітэктурных помнікаў. У той жа час неафіцыйны інфармацыйна-забаўляльны сайт **mypinsk.com** змяшчае больш за 50 артыкулаў па гісторыі краю, а іншы неафіцыйны сайт – **epinsk.net** – больш за 100 фотаздымкаў пінскіх вуліц і будынкаў. Дык што перашкаджае мясцовым уладам такім жа чынам паклапаціцца пра прэзентацыю сваёй гістарычнай спадчыны?

## ІНТАРЭС ПРЫВАТНЫ – КАРЫСЦЬ АГУЛЬНАЯ

Пры знаёмстве з гістарычным Байнэтам уражвае тое, што асобныя людзі сваімі ўласнымі праектамі робяць для захавання і папулярызацыі нашай гістарычнай спадчыны болей за цэлыя арганізацыі і ўстановы.

Напрыклад, найбольш вядомы і наведвальны не толькі ў Беларусі, але і за мяжой навуковы сайт «История Беларуси IX-XVIII веков. Первоисточники» (**starbel.narod.ru**) створаны і існуе дзякуючы энтузіязму аднаго чалавека – журналіста часопіса «Беларуская думка» Алега Ліцкевіча. А вось Антось Капялюш уласнымі сіламі стварыў сайт «Храмы Глыбоччыны», які можна пабачыць па адрасе **antos.kapyalush.at.tut.by**. Відавочна прыватны і пры гэтым даволі дасканалы сайт пра Брэсцкую крэпасць можна наведаць па адрасе **edik-ok.narod.ru**.

Група выкладчыкаў размясціла ў Інтэрнэце віртуальны курс лекцый па гісторыі Беларусі для студэнтаў (**belarusianhistory.narod.ru**). Мікалай Гайба з Навагрудка стварыў цудоўны сайт пра гісторыю роднага горада – **www.navahrudak.narod.ru**. А група аматараў фартыфікацыі і ваеннай гісторыі распрацавала праект **www.fortressby.com** – сайт пра крэпасці Беларусі і падзеі, звязаныя з імі.

І гэта далёка не ўсе, а толькі найбольш адметныя прыклады.

***

Што можна зазначыць, падсумоўваючы назіранні? Вобразна кажучы, беларуская Кліо ў Інтэрнэце вандруе ўжо досыць упэўнена, але пастаяннай прапіскі там пакуль не атрымала. Яна жаданая госця на розных сайтах – але запрашаюць яе туды з рознымі мэтамі. Хочацца верыць, што ў Год роднай зямлі колькасць нарэшце ператворыцца ў якасць і беларуская гістарычная спадчына ўладкуецца ў Байнэце як ва ўласнай хаце. ■